# КАНКУРЭНТНАЯ ПАЛІТЫКА НА МЫТНАЙ ТЭРЫТОРЫІ ЕАЭС І ХАРАКТЭРНЫЯ РЫСЫ НЯДОБРАСУМЛЕННАЙ КАНКУРЭНЦЫІ

**Д. А. Белая[1], Л. І. Тарарышкіна[2]**

*[1] магістрант спецыяльнасці "сусветная эканоміка" кафедры еўразійскіх даследаванняў, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*[2] кандыдат эканамічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры еўразійскіх даследаванняў, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, tararyshkina@rambler.ru*

Улічваючы той факт, што ЕАЭС імкнецца стварыць адзіны рынак тавараў, паслуг, капіталу і працоўных рэсурсаў, у рамках канкурэнтнай палітыкі Саюза праводзіцца антыманапольнае рэгуляванне, якое ажыццяўляецца антыманапольнымі органамі дзяржаў-членаў ЕАЭС і Еўразійскай эканамічнай камісіяй. Галоўнай мэтай з'яўляецца эфектыўнае ўзаемадзеянне антыманапольных органаў праз інфармацыйны абмен і сумесныя расследаванні парушэнняў правілаў канкурэнцыі ды гарманізацыя Нацыянальнага антыманапольнага заканадаўства. У артыкуле разглядаюцца прынятыя дзяржавамі-членамі ЕАЭС законы, якія рэгулююць канкурэнтную палітыку і спыненне нядобрасумленнай канкурэнцыі. Больш за тое, асобая ўвага надаецца саблівасцям такой канкурэнцыі, выяўленым праз аналіз і абагульненне інфармацыі ўпаўнаважаных органаў, у тым ліку, Еўразійскай эканамічнай камісіі.

***Ключевые слова:*** канкурэнтная палітыка; нядобрасумленная канкурэнцыя; мытная тэрыторыя ЕАЭС; антыманапольныя органы; Еўразійская эканамічная камісія.

У сучаснай навукаёмістай эканоміке абарона інтэлектуальнай уласнасці гуляе важную ролю для заахвочвання інавацыйнай і творчай дзейнасці ды для развіцця занятасці і павышэння канкурэнтаздольнасці. Праз пераход гандлю ў анлайн-фармат, а таксама змяненне асноўных лагістычных ланцужкоў неабходным становіцца вызначэнне напрамкаў развіцця канкурэнтнай палітыкі, улічваючы пры гэтым агульныя прыкметы нядобрасумленнай канкурэнцыі і сусветныя тэндэнцыі, змена падыходаў да выяўлення і спынення злачынстваў і правапарушэнняў у галіне ІУ, сталая распрацоўка сучасных методык барацьбы.

**Метады і арганізацыя даследавання**

Статыстычны і параўнальна-прававы метады, лагічны ды сістэмны аналіз, сінтэз і падагульненне.

Адной з асноўных мэт ЕАЭС з'яўляецца фарміраванне адзінага рынку тавараў, паслуг, капіталу і працоўных рэсурсаў. Канкурэнтная палітыка Саюза ўключае ў сябе не толькі нацыянальнае, але і трансгранічнае антыманапольнае рэгуляванне, якое ажыццяўляецца антыманапольнымі органамі дзяржаў-членаў ЕАЭС і Еўразійскай эканамічнай камісіяй (далей – ЕЭК). Фарміраванне адзінай канкурэнтнай палітыкі на мытнай

тэрыторыі ЕАЭС адбываецца гарманізацыяй Нацыянальнага антыманапольнага заканадаўства дзяржаў-членаў ЕАЭС і забеспячэннем эфектыўнасці ўзаемадзеяння іх антыманапольных органаў, у тым ліку праз інфармацыйны абмен і правядзенне сумесных расследаванняў, звязаных з парушэннем правілаў канкурэнцыі. Дадзеныя мэты атрымалі адлюстраванне ў першым міжнародным дагаворы Адзінай эканамічнай прасторы ў антыманапольнай сферы – Пагадненне аб адзіных прынцыпах і правілах канкурэнцыі, якое было прынята ў 2010 годзе (далей – Пагадненне).

Варта адзначыць, што на момант пачатку функцыянавання Пагаднення антыманапольныя органы дзяржаў-членаў ЕАЭС ужо пачалі ўзаемадзейнічаць паміж сабой. Да прыкладу, праз Штаб па сумесных расследаваннях парушэнняў антыманапольнага заканадаўства ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў, які быў створаны па рашэнні Міждзяржаўнага савета па антыманапольнай палітыцы. Вопыт паклаў пачатак выбудоўвання практычнага ўзаемадзеяння, мэтай якога стала ажыццяўленне зладжанай канкурэнтнай палітыкі ЕАЭС. У 2013 годзе ў рамках Адзінай эканамічнай прасторы, якая яшчэ функцыянавала на той момант, быў прыняты асноўны дакумент – Мадэльны закон “Аб канкурэнцыі”, які стаў сувязным звяном для збліжэння прававога рэгулявання эканамічных адносін у галіне канкурэнтнай палітыкі, пачатку дыялогу дзяржаў, а таксама распрацоўкі агульнага антыманапольнага заканадаўства. У рамках дадзенага дакумента былі аб’яднаны практычныя моманты антыманапольнага рэгулявання ў дзяржавах-членах адзінай эканамічнай прасторы, і ўлічаны замежны вопыт. У тэкст закона “Аб канкурэнцыі” былі ўнесены нормы, якія адлюстроўвалі практыку, тэндэнцыі ды перспектывы будучага развіцця антыманапольнага заканадаўства на тэрыторыі ЕАЭС.

У гэтай сувязі, 12.12.2013 Рэспубліка Беларусь прыняла Закон №94-З “Аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі”, дзе былі удакладнены паняційны апарат, а таксама асноўныя антыманапольныя забароны і паўнамоцтвы рэгулятара. Расійская Федэрацыя прыняла Федэральны Закон ад 05.10.2015 № 275-ФЗ “Аб унясенні змяненняў у Федэральны закон “Аб абароне канкурэнцыі” і асобныя заканадаўчыя акты Расійскай Федэрацыі”, які ўводзіў Чацвёрты антыманапольны пакет, накіраваны ўжо менавіта на лібералізацыю антыманапольнага рэгулявання, пашырэнне нормаў папераджальнага кантролю, падрабязную рэгламентацыю інстытута стрымання нядобрасумленнай канкурэнцыі, акцэнтаванне на нормах забароны злоўжывання дамінуючым становішчам, а таксама ўдасканаленне працэдурных нормаў у галіне разгляду антыманапольных спраў і на працэс адміністрацыйнага перагляду рашэнняў тэрытарыяльных органаў. Што тычыцца Рэспублікі Казахстан, у 2015 годзе быў адноўлены Закон Рэспублікі Казахстан ад 25.12.2008 №112-IV “Аб канкурэнцыі”, што страціў сваю сілу з 01.01.2016 згодна з Прадпрымальніцкім кодэксам Рэспублікі Казахстан ад 29.10.2015 №375-V, чатыры

главы каторага прысвечаны антыманапольнаму рэгуляванню, правядзенню расследаванняў і спыненню правапарушэнняў. Актыўная гарманізацыя антыманапольнага заканадаўства таксама вядзецца ў Рэспубліцы Арменія і Кыргызскай Рэспубліцы.

Што тычыцца ЕАЭС, на дадзены момант пытанні канкурэнтнай палітыкі адлюстраваны ў Дагаворы аб ЕАЭС. Асноўныя антыманапольныя забароны, базавыя прынцыпы, паняцці, правілы ўзаемадзеяння наднацыянальнага ды нацыянальных антыманапольных органаў дзяржаў-членаў ЕАЭС, ды прававыя асновы антыманапольных паўнамоцтваў ЕЭК адлюстраваны ў раздзеле XVIII Дагавора аб ЕАЭС. Агульнымі правіламі канкурэнцыі, адлюстраванымі ў ім, з'яўляюцца забарона і спыненне злоўжывання дамінуючым становішчам, антыканкурэнтныя пагадненні і нядобрасумленная канкурэнцыя. Камісія лічыцца наднацыянальным антыманапольным органам, упаўнаважаным на правядзенне антыманапольных расследаванняў адносна кампаній-рэзідэнтаў дзяржаў-членаў ЕАЭС, у тым выпадку, "калі правапарушэнні, што учынены імі, аказваюць або могуць аказаць негатыўны ўплыў на канкурэнцыю на трансгранічных рынках на тэрыторыях дзвюх і больш дзяржаў-членаў ЕАЭС, за выключэннем фінансавых рынкаў" [2]. ЕЭК валодае вызначанымі ў табліцы паўнамоцтвамі і мае такія абавязкі, як прадстаўленне ў Вышэйшы савет гадавой справаздачы аб стане канкурэнцыі на трансгранічных рынках і публікацыя рашэння па разгледжаных справах на афіцыйным сайце ЕАЭС.

**Паўнамоцтвы ЕЭК у сферы канкурэнтнай палітыкі**

| Права разглядаць заяву | Права ўзбуджаць і разглядаць справы аб парушэнні агульных правілаў канкурэнцыі | Права выносіць вызначэнні і прымаць рашэнне | Права запытваць і атрымліваць інфармацыю |
|---|---|---|---|
| ЕЭК прымае заяву і матэрыялы аб прыкметах парушэння агульных правілаў канкурэнцыі і вырашае, ці аказалі ўчыненыя дзеянні негатыўны ўплыў на стан канкурэнцыі на трансгранічных рынках | ЕЭК узбуджае справы і праводзіць расследаванне пры выяўленні прыкметаў парушэння агульных правілаў канкурэнцыі на трансгранічных рынках. У межах расследавання, ЕЭК праводзіць дбайны аналіз адпаведных трансгранічных рынкаў | ЕЭК выносіць вызначэнні і прымае рашэнні, абавязковыя для выканання ўсімі ўдзельнікамі рынку, якія абвінавачваюцца ў парушэнні правілаў канкурэнцыі на трансгранічных рынках | ЕЭК можа запытваць у органаў дзяржаўнай улады, органаў мясцовага самакіравання і кампаній любую інфармацыю (нават канфідэнцыйную), якая неабходна ЕЭК для ажыццяўлення сваіх паўнамоцтваў |

Составлено по: [3].

У адпаведнасці з п. 5 артыкула 75 Дагавора аб ЕАЭС, "рэалізацыя і правядзенне канкурэнтнай (антыманапольнай) палітыкі прадугледжвае

кантроль за выкананнем забароны на нядобрасумленную канкурэнцыю”. Згодна з пп. 1 Пратаколу, нядобрасумленнай канкурэнцыяй прызнаюцца разнастайныя дзеянні, якія:

- накіраваны на набыццё прывілеяў у прадпрымальніцкай дзейнасці гаспадарчага суб’екта / суб’екта рынку ці групы асоб або некалькіх гаспадарчых суб’ектаў / суб’ектаў рынку ці груп асоб;
- супярэчаць заканадаўству дзяржаў-членаў, звычаяў дзелавога абароту, патрабаванням добрапрыстойнасці, разумнасці і справядлівасці;
- ужо прычынілі альбо могуць прычыніць шкоду іншым гаспадарчым суб’ектам / суб’ектам рынку – канкурэнтам;
- ужо нанеслі альбо могуць нанесці шкоду іх дзелавой рэпутацыі.

Дагавор аб ЕАЭС прадугледжвае наступныя прынцыпы канкурэнтнай палітыкі (малюнак):




Прынцыпы канкурэнтнай палітыкі ЕАЭС.
Составлено по: [3]

У п. 2 артыкула 76 Дагавора аб ЕАЭС пералічаны наступныя формы нядобрасумленнай канкурэнцыі:

*1. распаўсюджванне ілжывых, недакладных або скажоных звестак*

Можа нанесці шкоду гаспадарчаму суб'екту або яго дзелавой рэпутацыі. Гэтая форма нядобрасумленнай канкурэнцыі таксама называецца дыскрэдытацыяй. Сам тэрмін "дыскрэдытацыя" згадваецца ў заканадаўстве Рэспублiцы Беларусь і Рэспублiцы Казахстан. Такая дзейнасць эканамічных аператараў накіравана на падрыў даверу спажыўцоў да эканамічнага аператара-канкурэнта і прыцягненне ўвагі спажыўцоў да іх уласных прадуктаў, тавараў і паслуг. Прадметам дыскрэдытацыі з'яўляюцца тавары канкурэнтаў, умовы іх продажу і, акрамя таго, стан таварнага рынку, на якім рэалізуецца тавар. Распаўсюджваннем ілжывай інфармацыі як актам нядобрасумленнай канкурэнцыі лічыцца толькі сама адмова ад правядзення добрасумленнай канкурэнцыі, сапраўды здольнай нанесці шкоду канкурэнту ў выніку дыскрэдытацыі [4]. Згодна з прыведзенай заканадаўчай фармулёўкай можна вылучыць тры прыкметы дыскрэдытацыі:

- распаўсюджванне інфармацыі (звестак);
- недакладнасць звестак, што распаўсюджваюцца;
- прычыненне шкоды (рэпутацыі) прадпрыемства гаспадарчага суб'екта.

*2. увядзенне ў зман наконт характару, спосабу, месца вырабу, а таксама спажывецкіх уласцівасцяў, якасці і колькасці тавару або ў дачыненні да яго вытворцаў*

Прынцыповае адрозненне паміж гэтымі відамі нядобрасумленнай канкурэнцыі заключаецца ў тым, што "ўвядзенне ў зман – вынік распаўсюджвання становчай інфармацыі аб дзейнасці распаўсюдніка або вытворцаў тавараў, якія ён прадае" [3]. Аднак жа тая інфармацыя, што распаўсюджваецца ў выпадку некарэктнай інфармацыі, таксама не павінна адпавядаць рэчаіснасці. Вышэй прыведзеная заканадаўчая фармулёўка змяшчае пералік аб'ектаў, у дачыненні да каторых магчыма ўвядзенне ў зман:

- "характар і спосаб вытворчасці (як тэхналогіі, што прымяняюцца пры вытворчасці тавару, так і іншыя ўмовы вытворчасці);
- месца вытворчасці (той геаграфічны аб'ект, на тэрыторыі якога была вытворчасць тавару (выкарыстанне пазначэнняў, каляровых рашэнняў, якія асацыююцца з якім-небудзь геаграфічным аб'ектам, у выніку чаго спажыўцы робяць выснову аб яго вытворчасці ў пэўным рэгіёне);
- спажывецкія ўласцівасці тавару (тыя уласцівасці, якія праяўляюцца ў працэсе спажывання тавару, колькасць і якасць тавару як сукупнасць тых ці іншых спажывецкіх уласцівасцяў);
- вытворцы тавару (тыя гаспадарчыя суб'екты, якія вырабілі тавар для яго наступнай рэалізацыі)" [1].

*3. некарэктнае параўнанне гаспадарчых суб'ектаў тавараў, якія ім вырабляюцца або рэалізуюцца, з таварамі, якія вырабляюцца або рэалізуюцца іншымі гаспадарчымі суб'ектамі*

Тут варта адзначыць, што некарэктнае параўнанне ў заканадаўстве ЕАЭС абмежавана толькі параўнаннем саміх тавараў, без параўнання гаспадарчых суб'ектаў-канкурэнтаў, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі аднаго рынку. Аднак жа, улічваючы той факт, што пералік формаў нядобрасумленнай канкурэнцыі з'яўляецца адкрытым, няправільнае параўнанне дзейнасці аднаго гаспадарчага суб'екта з дзейнасцю яго канкурэнтаў таксама будзе актам нядобрасумленнай канкурэнцыі, заснаваным на агульнай значнасці. Няправільнае параўнанне можа быць двух галоўных тыпаў: адмоўнае і станоўчае. Пры адмоўным параўнанні падыспытны схільны прыніжаць прадукцыю канкурэнтаў, пры гэтым хваліць сваю ўласную, а станоўчае параўнанне не аслабляе рэпутацыю канкуруючага прадукту, а выкарыстоўвае яго [4].

**Заключэнне**

Такім чынам, канкурэнтная палітыка – гэта комплекс паслядоўных мер, якія ажыццяўляюцца дзяржавай або аб'яднаннем дзяржаў у мэтах забеспячэння ўмоў для спаборнасці гаспадарчых суб'ектаў, павышэння канкурэнтаздольнасці і эфектыўнасці эканомік, мадэрнізацыі прадпрыемстваў і стварэння ўмоў для забеспячэння патрэбаў грамадства ў таварах і паслугах эканамічна эфектыўным спосабам. Варта адзначыць, што легальнае вызначэнне кожнай апісанай формы канкурэнтнай палітыкі не змяшчае абсалютна ўсе прыкметы нядобрасумленнай канкурэнцыі, таму пры прымяненні забароны на кожную канкрэтную форму павінны ўлічвацца агульныя прыкметы нядобрасумленнай канкурэнцыі, якія вынікаюць з паняцця, замацаванага ў арт. 1 Пратакола, а сам пералік формаў нядобрасумленнай канкурэнцыі ў праве ЕАЭС з'яўляецца адкрытым.

## Библиографические ссылки


1. В ЕАЭС упростится регистрация объектов интеллектуальной собственности [Электронный ресурс] // Евразийская Экономическая Комиссия : сайт. URL: http://www.eurasiancommission.org/ (дата обращения: 08.04.2024).
2. *Гаврилов Д., Черняга А.* Антимонопольное регулирование в Евразийском экономическом союзе. М.: Мосты, 2016. 5 с.
3. Договор о Евразийском экономическом союзе от 29.05.2014 [Электронный ресурс] // КонсультантПлюс: Беларусь. Технология Проф / ООО «ЮрСпектр», Нац. Центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2021. 154 с.
4. О Порядке взаимодействия, в том числе информационного, ЕЭК и уполномоченных органов государств-членов Таможенного союза и Единого экономического пространства в рамках Соглашения о единых принципах и правилах конкуренции от 09.12.2010 [Электронный ресурс] : решение Совета ЕЭК от 23.11.2012 г. № 96. URL: http://www.eurasiancommission.org/ (дата обращения: 08.04.2024).